Веснік БДУ. Сер. 4. 2005. № 2.

## *Дыскусіі*

*А.М. КАВАЛЕУСКІ*

# РУС КАЯ «ФАРМАЛЬНАЯ ШКОЛА» (ОПОЯЗ) І ПРАЖСКІ ЛІНГВІСТЫЧНЫ ГУРТОК: ПЕРАЕМНАСЦЬ ІДЭЙ І ЭВАЛЮЦЫЯ ПОГЛЯДАЎ

Рассмотрены становление, преемственность идей и исследовательских методов «формальной школы» в российском литературоведении (ОПОЯЗ) и Пражского Лингвистического Кружка, а также их участие в формировании методологии современного гуманитарного знания.

The formation and succession of ideas and research methods of «formal school» in Russian literary criticism and Prague Linguistic Circle are examined as well as their participation in the formation of the methodology of modern humanitarian knowledge.

Руская «фармальная школа» ў гісторыі літаратуразнаўства, культуры і гуманітарнай думкі XX ст. з'яўляецца феноменам знакавым і выключным. Выступаючы супраць эклектызму ў літаратуразнаўстве, прадстаўнікі «фармальнай школы» распрацавалі і актыўна прымянялі параўнальна-тыпалагічны метад у сваіх даследаваннях, выпрацавалі новыя лінгвістычныя ідэі, увялі статыстычныя формы вывучэння літаратурных твораў, прайшоўшы шлях ад выключна механістычных уяўленняў аб мастацкім цэлым як сукупнасці выключна фармальных прыёмаў да дынамічнага разумения функцыянальнай сувязі ўсіх яго кампанентаў. У некаторых краінах Заходняй Еўропы нават утварылася меркаванне аб тым, што навуковы вопыт рускай «фармальнай школы» паспрыяў стварэнню асноў сучаснай метадалогіі ў гуманітарных навуках.

Руская «фармальная школа» з'явілася спадкаемцам шэрага філасофскіх, эстэтычных, літаратурных плыняў і даследчых сістэм мінулых стагоддзяў. У прыватнасці, такіх як канцэпцыя фармальнай этыкі І.Ф. Гербарта (1776-1841), а таксама іншых тэндэнцый фармалізму ў філасофіі і эстэтыцы, пачынаючы ад фармалізму радыкальнага і ўмеркаванага да ягоных версій у межах марфалогіі літаратурнага твора, якія зблізілі рускую «фармал^л^ную школу» з Новай Крытыкай (New Criticism). Кансалідацыі «фармальнай школы» спрыяла як яе апазіцыя, так і яўныя яе прыхільнікі. «Фармалісцкі падыход да выпрацоўкі навуковага погляду на літаратуру ў сваёй ранняй стадыі, у якой ён выступаў у форме адмаўлення папярэдняга літаратуразнаўства і ў форме праектаў новай навукі, быў настолькі ж радыкальны, як і маніфесты рускіх футурыстаў, чые праграмы і літаратурная практыка першапачаткова таксама значна паўплывалі на яго» (Аймермахер 1997, 73). (Тут і далей пераклад аўтара. -А К.) Маладыя фармалісты крышталізавалі свае погляды ў барацьбе з сімвалізмам, акмеізмам і іх дактрынамі, а таксама з імпрэсіяністцкай крытыкай, якая падтрымлівала гэтыя накірункі; не дзіўна, што канцэпцыі расійскага футурызму былі блізкія прадстаўнікам школы. Не звяртаючы ўвагі на традыцыйнае літаратуразнаўства, пазбаўленае, на думку прадстаўнікоў фармальнай школы, навуковасці, яны цалкам адхілілі ўласцівы яму гістарызм, сацыялагізм, псіхалагізм і дыдактызм. Яны засяродзіліся толькі на дзвюх школах, пазіцыі якіх супадалі з іх поглядамі. Гэта, па-першае, канцэпцыя паэтычнай мовы А.А. Патэбні, згодна з якой «элементам слова з жывым уяўленнем адпавядаюць элементы паэтычнага твора, бо такое слова і само па сабе з'яўляецца ўжо паэтычным творам» (Потебня 1990, 140). Па-другое, гэта - школа А.М. Весялоўскага.

Аднак сапраўдную апору маладыя фармалісты знайшлі ў расійскім мовазнаўстве, якое ў той час вызначалася высокім узроўнем развіцця, асабліва ў трох лінгвістычных цэнтрах. Першы з іх - універсітэцкі асяродак у Маскве пад кіраўніцтвам Ф.Ф. Фартунатава, які аб'ядноўваў такіх яго вучняў, як В.К. Пар-

жазінскі, В.М. Шчэпкін, Дз.М. Ушакоў і інш. Засвоіўшы лінгвістычныя канцэпцыі младаграматыкаў, яны распрацоўвалі структуралісцкія катэгорыі, асабліва ў дачыненні да пытанняў марфалогіі. 3 гэтага асяродка выйшлі Р.В. Якабсон і М.С. Трубяцкой. У Маскве ў 1915 г. па ініцыятыве студэнтаў-філолагаў і пры падтрымцы Маскоўскай дыялекталагічнай камісіі (створанай па ініцыятыве А.А. Шахматава ў 1903 г. пры Аддзяленні рускай мовы і славеснасці пры Пецярбургскай АН) быў арганізаваны Маскоўскі Лінгвістычны Гурток, які праводзіў даследаванні ў галіне лінгвістыкі і паэтыкі. Некаторыя з удзельнікаў Гуртка ўдзельнічалі ў стварэнні ОПОЯЗа (Общество изучения поэтического языка) - базы рускай «фармальнай школы». Другім пасля Маскоўскага Лінгвістычнага Гуртка быў вядомы універсітэцкі асяродак у Казані на чале з Бадуэнам дэ Куртэнэ. Менавіта гэты асяродак з'явіўся, з аднаго боку, галоўным натхняльнікам паэтыкі футурыстаў, а з іншага - уплываў на выпрацоўку канцэпцый маладых даследчыкаў літаратуры з ОПОЯЗа. Трэці лінгвістычны асяродак знаходзіўся ў Петраградзе.

Крышталізуючы свае погляды і сваю праблематыку на шляху барацьбы з традыцыяналісцкімі палажэннямі ў мастацтве і літаратуразнаўстве, а таксама дзякуючы наватарскім лінгваэстэтычным распрацоўкам, руская «фармальная школа» набыла свой выразны профіль. Сярод яе найбольш адметных рысаў і здабыткаў можна выдзеліць некалькі. 3 аднаго боку, яна вылучыла (фактычна ўпершыню) тэорыю літаратуры як самастойную дысцыпліну ў шэрагу навук аб літаратуры. 3 іншага боку, паслядоўна і арганічна выяўляла сувязі літаратурнай навукі з лінгвістыкай (таксама ўпершыню). У рэшце рэшт, першая пайшла не шляхам дэкларацый, а шляхам даследчыцкім, калі тэарэтызаванне наўпрост залежыць ад практычных эксперыментаў. Менавіта такі падыход спрыяў новаму тыпу мыслення ў катэгорыях структуралізму і семіялогіі. Важна падкрэсліць, што «...развіццё фармалізму, структуралізму і семіётыкі характарызуе <...> пэўная ўнутраная дэтэрмінаванасць, якая <...> прынцыпова адрознівае гэтыя канцэпцыі ад іншых як канцэпцыі дынамічныя» (Аймермахер 1997,72).

Па ініцыятыве В.М. Брыка, некалькі найбольш актыўных маладых літаратуразнаўцаў і лінгвістаў выдалі ў Петраградзе ў 1916 г. зборнік даследаванняў, прысвечаных паэтычнай мове, пад назваю *Poetica,* які стаў пачаткам аднайменнай выдавецкай серыі, што выконвала функцыі афіцыйнага друкаванага органа заснаванага ў 1916 г. ОПОЯЗа. Яго ініцыятарамі былі В.Б. Шклоўскі, Л.П. Якубінскі, Б.В. Тамашэўскі, В.М. Брык, Б.І. Ярхо. В.М. Жырмунскі, які далучыўся да стварэння школы, падкрэсліваў, што «...удзельнікаў зборніка аб'ядноўвае разумение паэзіі як славеснага мастацтва, якое патрабуе ад даследчыка перш за ўсё тэарэтычнага вывучэння законаў паэтычнай мовы ў яе адрозненне ад празаічнай» (Жирмунский 1928, 338). Выдатнейшымі стваральнікамі школы былі Шклоўскі, Б.М. Эйхенбаум, Ю.М. Тынянаў, Р.В. Якабсон і В.Ул. Вінаградаў.

Даволі хутка ў жыцці рускай «фармальнай школы» вылучыліся два яе асноўныя перыяды, якія адрозніваліся дамінуючай праблематыкай, а таксама - прынамсі ў некаторай ступені - даследчыцкім падыходам і формай выказвання. У першым перыядзе артыкулы, асабліва палемічныя, характарызаваліся публіцыстычным стылем (напрыклад, артыкулы Брыка), іранічнай шаржыроўкай слова і парадаксальнасцю сцвярджэнняў. У другім перыядзе форма выказвання мела чыста навуковы характар. Прамежкавым этапам паміж гэтымі перыядамі можна лічыць 1925 г., калі былі падсумаваныя і асэнсаваныя некаторыя творчыя дасягненні і навуковы вопыт фармальнай школы. Канцэпцыя паэтычнай мовы як сістэмы, якой трымаліся некаторыя фармалісты, была звязаная з некаторымі моўнымі канцэпцыямі расійскіх футурыстаў, а таксама з іх творчымі эксперыментамі. У якасці прыкладу можна прывесці канцэпцыю мудрагелістай мовы, так званай «мудрагельшчыны», якая, напрыклад, абсалютызавала (з мастацкіх пазіцый) з'яву гласалаліі ў тых ці іншых яе праявах.

Другі перыяд развіцця рускай «фармальнай школы», якая, не парваўшы сувязей з духам авангардызму, перайшла на строгія навуковыя пазіцыі і чый

уклад у літаратуразнаўства стаў адпраўным пунктам не толькі для некаторых ідэй Пражскага Лінгвістычнага Гуртка, а таксама для сучасных структуралісцкіх і семіятычных школ, звычайна характарызуецца як час пераасэнсавання і ўдакладнення некаторых навуковых канцэпцый першага перыяду, імкненння да сінтэзу і да пашырэння даляглядаў навукі аб літаратуры, якія раней ігнараваліся.

Адным з вядучых і рэпрэзентатыўных даследчыкаў другога перыяду быў Тынянаў. Абапіраючыся на ўжо выпрацаваную Эйхенбаумам, Шклоўскім і іншымі лінгвістычную, структуралісцкую і семіятычную канцэпцыі, Ю. Тынянаў стварыў сінтэзуючую тэорыю рэчаіснасці, вельмі важную для вызначэння месца літаратуры ва ўсёй цэласнасці аб'ектыўнай рэчаіснасці, якая дапамагала ўпарадкаванасці даследчыцкага паняційнага апарату. Важнай для будучыні навукі аб літаратуры аказалася прапанаваная Тынянавым дыферэнцыяцыя формы і функцыі літаратурнага элемента, а значыць, і літаратурнага знака, а таксама сцвярджэнне, што ў літаратуры (і ў іншых мастацкіх сістэмах) гэтыя паняцці («форма» і «функцыя») з'яўляюцца непадзельнымі і маналітнымі: «...літаратурны твор з'яўляецца сістэмаю і сістэмаю з'яўляецца літаратура. <...> Суаднесенасць кожнага элемента літаратурнага твора як сістэмы з іншымі і, такім чынам, з усёй сістэмай я называю канструктыўнай *функцыяй* дадзенага элемента. Пры больш блізкім разглядзе аказваецца, што такая функцыя - паняцце складанае. Элемент суадносіцца адразу: з аднаго боку, па шэрагу падобных элементаў іншых твораў-падсістэм, і нават іншых шэрагаў, з іншага боку, з іншымі элементамі дадзенай сістэмы (аўтафункцыя і сінфункцыя). <...> Сувязь функцыі і формы не выпадковая. <...> Пераменнасць функцый таго ці іншага фармальнага элемента, узнікненне той ці іншай новай функцыі ў фармальнага элемента, замацаванне яго за функцыяй - важныя пытанні літаратурнай эвалюцыі...» (Тынянов 2002, 192, 198).

Гаворачы пра эвалюцыю рускай «фармальнай школы» ў двух перыядах яе развіцця, нельга не заўважыць эвалюцыю поглядаў яе асобных прадстаўнікоў, некаторыя з якіх выходзілі за межы фармалізму. Сярод такіх асобаў вылучаюцца, у першую чаргу, Жырмунскі і Вінаградаў. Сувязь Жырмунскага з фармальнай школай была эпізадычнай; вядомы ўжо гісторык літаратуры і знаўца рамантычнай нямецкай думкі, ён мог толькі на адносна кароткі час захапіцца праграмай вузкіх даследаванняў «літаратурнасці». Іншым шляхам праходзіла эвалюцыя поглядаў Вінаградава. Першапачаткова прыхільнік ОПОЯЗа, потым, з 1923 г., яго праціўнік, Вінаградаў выступіў супраць працы Эйхенбаума пра Г. Ахматаву, дзе адчувалася тэорыя паэтычнай мовы ў яе «опоязаўскім» разуменні. Узняўшы тую ж самую тэму, Вінаградаў кіраваўся прынцыпамі лінгвістычнай семантыкі адносна аналізу паэтычнай сімволікі Г. Ахматавай, папракаючы Эйхенбаума ў адрыве ад мастацкай канкрэтыкі і ў недакладнасці моўнага аналізу. У сваю чаргу Эйхенбаум выступаў супраць метаду Вінаградава: «Я глыбока не згодны са спробай В. Вінаградава <...> паказаць мову Ахматавай у выглядзе асацыятыўных "семантычных гнёздаў". <...> Прымяненне такога лінгвістычнага метаду да паэтычнай мовы здаецца мне зусім памылковым, таму што звычайная "моўная свядомасць" І мова паэта, якая адмыслова сфарміравана і падпарадкоўваецца мастацка-стылістычным законам і традыцыям, павінны быць прызнаны з'явамі, якія адрозніваюцца па самой сваёй прыродзе» (Эйхенбаум 1969, 145).

Руская «фармальная школа», супрацьпастаўляючы сябе традыцыйнай навуцы аб літаратуры і рэзка крытыкуючы некаторых яе прадстаўнікоў, была таксама варожа настроеная супраць пазіцый марксісцкага даследчага напрамку, які ўсё больш актыўна і агрэсіўна займаў месца ў савецкай навуковай практыцы і ў рэшце рэшт перамог, ператварыўшыся ў праваднік ідэалагічнай прапаганды нават у літаратуразнаўстве. Аб'ектам яго атакі была метадалогія фармалістаў, а не іх аналітычныя дасягненні, якія ўсё ж былі з часам прызнаныя пасля ніверліравання іх агістарызму і акцэнтацыі гістарычнага аспекту. У выніку гэтага «фармальная школа» ў Савецкім Саюзе спыніла сваё існаванне на пачатку 30-х гг. XX ст.

Нягледзячы на скасаванне фармальнай школы, яе прынцыпы, некаторыя канцэпцыі і дасягненні прыжыліся ў еўрапейскім навуковым асяроддзі і аказалі на яго значны ўплыў. Адбылося гэта па прычыне блізкасці даследчых канцэпцый школы накірункам, папулярным на Захадзе, такім, напрыклад, як семантычна арыентаваная Новая Крытыка (New Criticism), рацыяналістычны французскі эстэтызм з лінгвістычным ухілам ці нават эргацэнтрычная плынь нямецкіх даследаванняў. Але ўсё ж наймацнейшыя і непасрэдныя сувязі замацаваліся паміж рускай «фармальнай школай» і школай, створанай у Чэхаславакіі ў 30-я гг. XX ст., - цэнтрам лінгвістычных і літаратурных даследаванняў «Пражскі Лінгвістычны Гурток». Потым - праз Пражскі Гурток - руская «фармальная школа» паўплывала на лінгвістычна-літаратурныя школы Злучаных Штатаў і Еўропы, якія сфарміраваліся ў час Другой сусветнай вайны і пазней перажылі свой росквіт. Стваральнікам адной з такіх школ і яе лідэрам быў Раман Якабсон. Варта адзначыць, што некаторыя ідэі і канцэпцыі расійскай фармальнай школы былі пакладзеныя ў падмурак асяродка неафармалізму ў Францыі (Ц. Тодараў, Ю. Крысцева) і ў Англіі, аднак асноўнай апорай для іх даследаванняў служаць здабыткі агульнага мовазнаўства.

Як мы ўжо адзначылі, у 1926 г. сфарміраваўся Пражскі Лінгвістычны Гурток, ініцыятарамі якога былі В. Матэзіус, Б. Гаўранэк, Я. Мукаржоўскі і Якабсон (ён жыў у Чэхаславакіі з 1921 г.). Гурток аб'яднаў не толькі кола заслужаных навукоўцаў, але і шэраг маладых, якія кантактавалі і супрацоўнічалі з такімі рускімі даследчыкамі, як знакаміты лінгвіст М.С. Трубяцкой, літаратуразнаўцы Тынянаў, Д.І. Чыжэўскі, які ў 1924-1933 гг. знаходзіўся ў Празе і дзякуючы якому гурток даволі хутка займеў рэпутацыю аднаго з вядучых навуковых цэнтраў. Адбылося гэта ў 1928 г., калі гурток прадставіў уласныя тэзісы на I Міжнародным лінгвістычным кангрэсе ў Гаазе.

Гісторыя Пражскага Лінгвістычнага Гуртка налічвае больш за 20 гадоў (з 1926 г. да пач. 1950-х гг.) і вылучаецца нарастаючымі з года ў год багатымі творчымі набыткамі, якія з'явіліся вынікам эвалюцыі даследчыцкіх поглядаў, дзякуючы, у першую чаргу, Мукаржоўскаму. На працягу ўсяго часу існавання Пражскага Лінгвістычнага Гуртка яго ўдзельнікі кіраваліся прынцыпамі структуралісцкай арыентацыі. «Істотнай характэрнай рысай пражскага структуралізму з'яўляецца *свядомае і адносна сістэматычнае фармуляванне даследчыцкіх прынцыпаў* для літаратурных і эстэтычных прадметных галін, якія служылі адпраўным пунктам і для рускага фармалізму, які, аднак, не вылучыў іх з такой дакладнасцю ў якасці метадалагічных асноватворных элементаў сваёй даследчай сістэмы, як гэта зрабіў пражскі структуралізм. <...> Другая адметная рыса пражскага структуралізму праяўляецца ў *пашырэнні аб'ектнай галіны* вывучэння» (Аймермахер 1997, 83).

Калі паэтычны твор - функцыянальная структура, то гэта азначае не толькі, што кожны ягоны элемент мае ўласцівы сабе сэнс у дадзенай цэласнасці, але таксама і тое, што ў гэтай цэласнасці кожны элемент выконвае разнародныя функцыі. Адсюль вынікае, што аналіз асобнага твора не можа абмяжоўвацца разглядам у ім рэалізацыі толькі адной з плоскасцей паэтычнай мовы (паэтычнай марфалогіі, сінтаксісу, лексікі ці фаналогіі). Сярод тых моўных плоскасцей паэтычная фаналогія была самай нераспрацаванай, таму выклікала асаблівую зацікаўленасць «пражцаў». Фаналогія, узніклая як асобны і прынцыпова важны раздзел мовазнаўства толькі ў XX ст., складае падмурак фаналогіі паэтычнай, якую можна акрэсліць як гукавую семантыку ў паэзіі.

Праблемы і задачы паэтычнай мовы, паэтычнасці, паэзіі, паэтычнага твора ўвесь час знаходзіліся на прыярытэтным месцы ў даследаваннях удзельнікаў Пражскага Лінгвістычнага Гуртка. Так, Мукаржоўскі падкрэслівае, што для эстэтыкі паэтычнай мовы, якая безупынна змяняецца гістарычна, крыніцай з'яўляецца тая ці іншая нацыянальная мова з усімі яе ўласцівасцямі, якія калісьці сфарміраваліся і якія ўвесь час паўстаюць на шляху гістарычнага развіцця мовы. Асабліва важным вывадам у даследаваннях Мукаржоўскага з'яўляецца меркаванне, што сукупнасць элементаў паэтычнай мовы заўсёды

змяняецца і рэструктурызуецца па прычыне эстэтычнай эфектыўнасці ўсяго выказвання; вылучэнне ў ёй на першы план аднаго з элементаў цягне за сабой (згодна са структуральнымі рэляцыямі) змену сістэмы ўсіх іншых элементаў. Адсюль бярэ свой пачатак шлях да вялікага багацця, з аднаго боку, паэтычных моў у межах абагульненай паэтычнай мовы (напрыклад, мовы літаратурных жанраў і родаў), а з іншага боку, да індывідуальнага моўнага забеспячэння твораў. Даследуючы сітуацыю паэтычнай мовы ўнутры паэтычнага твора, Мукаржоўскі стварае тэорыю, якая выходзіць за межы чыста тэкставыя. Дапамог яму ў гэтым зварот да семантыкі. Унутраная будова моўнага знака прымусіла даследчыка шукаць вартасці паэтычнага твора, звязаныя з яго значэннем, прычым са значэннем як цэлага твора, так і ягоных частак; вывучэнне «семантычнага ўзаемадзеяння» разнародных элементаў і іх комплексаў у творы паказала, з аднаго боку, наяўнасць унутранай семантычнай канструкцыі твора, а з другога - вылучыла розныя ўзроўні семантычных утварэнняў і іх узаемадзеянне.

Арыгінальнасць тэорыі паэтычнага твора Мукаржоўскага праявілася таксама ў стварэнні канцэпцыі статычнай і дынамічнай сэнсавай адзінкі. Даследчык сцвердзіў, што моўнае выказванне з'яўляецца сэнсавым струменем, які па чарзе ўцягвае словы ў супольную плынь, пазбаўляючы іх у значнай ступені семантычнай самастойнасці; кожнае слова ў выказванні з пункту гледжання сэнсу застаецца «адкрытым» аж да заканчэння выказвання. Дынамічная сэнсавая адзінка прынцыпова адрозніваецца ад статычнай тым, што выступае як спадчынна рэалізаваны кантэкст. Статыка і дынаміка, з аднаго боку, з'яўляюцца дзвюма супрацьлеглымі сіламі, а з іншага - звязаныя істотным спосабам. Разам яны складаюць прынцыповую дыялектычную антыномію кожнага сэнсавага працэсу. Іх палярнасць - усюдыісная - выступае не толькі там, дзе паяўляецца моўнае значэнне альбо слова з дапамогаю мовы. «Перш за ўсё засяродзім нашу ўвагу на паняцці "структура", якое таксама тычыцца не толькі мастацтвазнаўства. Самае шырокае вызначэнне гаворыць аб структуры як аб цэлым, аднак існуе нямала паняццяў "цэлага", у тым ліку і яўна памылковых (напрыклад, тое, што носіць назву "халізм"). Для нас структура толькі такое цэлае, якое ўнутрана і прытым дынамічна арганізавана, г. зн. цэлае, якое ўвесь час мяняецца, аб'яднанае зусім не гармоніяй складальнікаў, а ў першую чаргу напружаннем паміж імі, г. зн. супярэчнасцямі ці, калі хочаце, супрацьлегласцямі - у залежнасці ад таго, у якім сэнсе мы выкарыстоўваем гэтыя словы» (Мукаржовский 1994, 309, 312).

Дзякуючы падыходу, звязанаму з лінгвістычнай семантыкай, Мукаржоўскі пазбегнуў небяспекі, якая пагражала літаратуразнаўству ў выпадку яго поўнага падпарадкавання лінгвістычным метадам. У выніку, дзякуючы дыялектычнаму разуменню структуры як дынамічнай цэласнасці, якая развіваецца праз напружаны рух унутраных супярэчнасцей, даследчык праінтэрпрэтаваў не толькі ўнутраную будову твора, але і адносіны асобных твораў да літаратурнага працэсу, літаратуры - да іншых мастацтваў, да культуры І да грамадскай структуры ўвогуле. Важна падкрэсліць, што, паводле Мукаржоўскага, паэтычны твор не толькі адлюстроўвае тыя ці іншыя адлюстраваныя ў ім фрагменты рэчаіснасці, але паказвае на жыццёвую цэласнасць самой рэчаіснасці.

Звязаная з лінгвістыкай, семантычная праблематыка літаратуры, знамянальная для Пражскага Лінгвістычнага Гуртка, знайшла свой працяг у час Другой сусветнай вайны (пры садзеянні Якабсона) у ,Скандынаўскіх краінах, а пасля вайны атрымала папулярнасць у Злучаных Штатах і Еўропе. Характэрным для новых накірункаў стала ўцягненне літаратурнай праблематыкі выключна ў сферу лінгвістыкі, што, з аднаго боку, прыдало даследаванням вузкаспецыяльны характар, а з другога - абмежавала існуючую даўней праблематыку.

Дасягненні рускай «фармальнай школы» і Пражскага Лінгвістычнага Гуртка ў значнай ступені паўплывалі на развіццё савецкага літаратуразнаўстза і

лінгвістыкі, асабліва на станаўленне савецкага структуралізму, які пачаў актыўна развівацца з канца 1950-х гг. Паралельна з гэтым працэсам ішло засваенне наватарскіх канцэпцый у галіне семіётыкі (І.А. Бадуэн дэ Куртэнэ, Я.Дз. Паліванаў, П.А. Фларэнскі, П.Р. Багатыроў, М.М. Бахцін і інш.). .Пачынаючы з 1962-1964 гг., літаратуразнаўцы з Тарту і Ленінграда (Ю.М. Лотман, Б.Ф. Ягораў і інш.) актыўна супрацоўнічалі з лінгвістамі Маскоўскай школы, імкнучыся стварыць структурную семіётыку. Савецкі структуралізм (Маскоўская і Тартуская школы) уяўляў сабой найбольш паслядоўную з метадалагічнага пункту гледжання спробу выпрацоўкі новага падыходу ў гуманітарных навуках пасляваеннага часу.

Л ІТАРАТУРА


Аймермахер К. Знак. Текст. Культура. М., 1997.

Жирмунский В.М. Вопросы теории литературы. Л., 1928.

Мукаржовский Я. Исследования по эстетике и теории искусства. М., 1994.

Потебня А. А. Теоретическая поэтика. М., 1990.

Semiotyka i struktura tekstu / Pod red. M.R. Mayenowej. Wroctaw, 1973.

Тынянов Ю.Н. Литературная эволюция. Избранные труды. М., 2002.

Эйхенбаум Б. О поэзии. Л., 1969.


Паступіў у рэдакцыю 27.05.04.

*Арцём Мікалаевіч Кавалеўскі* - аспірант кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі. Навуковы кіраўнік-доктар філалагічных навук, прафесар Е.Л. Бондарава.